и материальной. Для упорядочения данных процессов Советом Министров Республики Беларусь постановлением от 27 июня 2011 г. № 849 принято Положение о порядке открытия подготовки по профилям образования, направлениям образования, специальностям, направлениям специальностей, специализациям. В соответствии с ним с сентября 2011 г. открытие творческих специальностей в системе Министерства образования должно согласовываться с Министерством культуры.

В настоящее время осуществляется мониторинг практики применения Кодекса об образовании. Для этого ГУО «Институт культуры Беларуси» изучены, обобщены и внесены более 15 предложений, связанных со спецификой отрасли.

Планируемая Министерством образования оптимизация сроков обучения в системе среднего и высшего специального образования также может негативно повлиять на художественное профессиональное образование, если уже сейчас не выработать критерии, определяющие особенности подготовки кадров в разрезе каждой специальности и каждого учреждения образования.

На реформирование системы образования существенное влияние оказывает процесс присоединения к Болонской декларации. Ни одна из европейских стран, подписавшая Болонское соглашение, не спешит расставаться с собственной национальной системой. Наша политика в отношении художественного профессионального образования должна быть взвешенной, ибо доказала свою эффективность, востребованность наших выпускников не только в собственной стране, но и за рубежом.

В заключение отметим, что основными направлениями дальнейшего развития образования в сфере культуры могут стать:

— межведомственная координация по подготовке творческих кадров на уровне Министерства культуры и Министерства образования для предотвращения дублирования и с учетом потребностей рынка труда;

— совершенствование законодательных нормативных документов и актов, создание концепции развития профессионального художественного образования;

— упорядочение отраслевой системы научно-методического и информационно-методического обеспечения учреждений образования и ее финансирование;

— пиар-деятельность (привлечение современных информационных технологий и всех видов СМИ для формирования имиджа творческих профессий).

Summary

*This article briefly and concisely describes the author's point of view on the issue of personnel training for the sphere of culture in contemporary realities, both in its positive and negative manifestations. The article offers a perspective for a broad discussion.*

**М. Л. Кузьмініч**

# Мастацкая адукацыя ў нацыянальнай адукацыйнай сістэме: арганізацыйна-змястоўны і нарматыўна-прававы аспекты

*У артыкуле ў кантэксце асноўных палажэнняў Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі разглядаюцца наступныя пытанні: месца мастацкай адукацыі ў структуры нацыянальнай сістэмы адукацыі, структура сістэмы мастацкай адукацыі, установы і арганізацыі агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі.*

У педагогіцы паняцце «мастацкая адукацыя» шырока выкарыстоўваецца і адносіцца да суб'ектаў адукацыйных зносін, якія здзяйсняюць адукацыйную дзейнасць і ўступаюць у грамадскія адносіны, звязаныя з рэалізацыяй права грамадзян на адукацыю і стварэннем у дзяржаве для гэтага адпаведных умоў, на прадмет вырашэння мастацка-адукацыйных задач.

Грамадскія адносіны ў сферы адукацыі Беларусі рэгулююцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, іншымі заканадаўчымі актамі, а таксама Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (далей — Кодэкс), які ўступіў у сілу з 1 верасня 2011 г. *Мастацкая адукацыя* мае шмат агульнага з нацыянальнай сістэмай адукацыі, часткай якой з'яўляецца. Таму адукацыйная дзейнасць суб'ектаў мастацка-адукацыйных адносін, асноўныя прынцыпы функцыянавання і пабудовы музычнай адукацыі таксама рэгулююцца Кодэксам.

*Сістэма адукацыі* — сукупнасць кампанентаў, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і накіраваны на дасягненне мэты адукацыі. У яе структуру

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўваходзяць: удзельнікі адукацыйнага працэсу (навучэнцы, педагагічныя работнікі), адукацыйныя праграмы, установы адукацыі, арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія здзяйсняюць адукацыйную дзейнасць ці забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы адукацыі, арганізацыі — заказчыкі кадраў, а таксама рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і некаторыя іншыя арганізацыі і фізічныя асобы (Кодэкс, арт. 11).

Адукацыя падраздзяляецца на ***асноўную, дадатковую і спецыяльную***. Кожная з іх рэалізуе адукацыйныя праграмы адпаведна асноўнай, дадатковай і спецыяльнай адукацыі.

*Асноўная адукацыя* ўключае ў сябе ўзроўні дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і паслядыпломнай адукацыі. *Дадатковая адукацыя* падраздзяляецца на два віды: дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі і дадатковая адукацыя дарослых. *Спецыяльная адукацыя* (для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця) рэалізуе адукацыйныя праграмы на ўзроўнях дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі (Кодэкс, арт. 12, 13).

*Суб'ектамі мастацка-адукацыйных адносін* з'яўляюцца ўдзельнікі адукацыйнага працэсу — навучэнцы (законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў), педагагічныя работнікі, установы адукацыі, дзяржаўныя органы кіравання, разнастайныя арганізацыі і фізічныя асобы, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы ці забяспечваюць дзейнасць сістэмы адукацыі.

*Кіраванне ў адукацыйнай сферы* мае дзяржаўна-грамадскі характар і здзяйсняецца на прынцыпах законнасці, дэмакратыі, гласнасці, уліку грамадскай думкі і сістэмнасці кіравання адукацыяй. Яно мае на мэце правядзенне дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі, удасканаленне і развіццё сістэмы адукацыі, рэалізацыю адукацыйных праграм і праграм выхавання (Кодэкс, арт. 105). Дзяржаўнае кіраванне ў сферы мастацкай адукацыі здзяйсняюць Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Сістэма мастацкай адукацыі інтэгравана ў нацыянальную адукацыйную сістэму. *Адукацыйныя праграмы агульнай мастацкай адукацыі* рэалізуюцца ва ўстановах дадатковай і спецыяльнай адукацыі, а таксама ва ўстановах асноўнай адукацыі на дашкольным, агульным сярэднім, прафесійна-тэхнічным, а таксама сярэднім спецыяльным, вышэйшым узроўнях не мастацкага профілю. *Адукацыйныя праграмы прафесійнай мастацкай адукацыі* рэалізуюцца ва ўстановах асноўнай адукацыі мастацкага профілю на ўзроўнях сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Інтэграцыя сістэмы мастацкай адукацыі ў нацыянальную сістэму адукацыі прадстаўлена ў табл. 1.

Табліца 1

**Інтэграцыя сістэмы мастацкай адукацыі ў нацыянальную сістэму адукацыі**

| Нацыянальная сістэма адукацыі \ Сістэма мастацкай адукацыі | | Агульная мастацкая адукацыя | Прафесійная мастацкая адукацыя | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | пачатковая | сярэдняя спецыяльная | вышэйшая |
| Асноўная адукацыя | Дашкольная | * | - | | |
| | Агульная сярэдняя,<br>у т. л. комплекс «школа–каледж мастацтваў» | *<br>* | -<br>* | -<br>* | <br>- |
| | Прафесійна-тэхнічная | * | - | - | - |
| | Сярэдняя спецыяльная,<br>у т. л. музычнага профілю | *<br>- | -<br>- | -<br>* | -<br>- |
| | Вышэйшая,<br>у т. л. мастацкага профілю | *<br>- | -<br>- | -<br>- | -<br>* |
| | Паслядыпломная,<br>у т. л. мастацкага профілю | *<br>- | -<br>- | -<br>- | -<br>- |
| Дадатковая адукацыя | Дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі | * | * | - | - |
| | Дадатковая адукацыя дарослых | * | * | - | - |
| Спецыяльная адукацыя | Дашкольная | * | - | - | - |
| | Агульная сярэдняя | * | - | - | - |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Табліца 1 дэманструе найбольш распаўсюджаныя варыянты атрымання агульнай і (ці) прафесійнай мастацкай адукацыі. Дынамізм грамадскага развіцця, адпаведныя змены ў сістэме адукацыі могуць прывесці да рэалізацыі і іншых варыянтаў атрымання прафесійнай мастацкай адукацыі.

Сістэма мастацкай адукацыі адлюстроўвае сучасны ўзровень мастацкай культуры грамадства, садзейнічае росту выканальніцкага майстэрства, актывізацыі мастацка-асветніцкай дзейнасці, далучэнню шырокага кола насельніцтва да мастацтва.

Мастацка-адукацыйныя праграмы рэалізуюцца (могуць рэалізоўвацца) на ўсіх узроўнях асноўнай і спецыяльнай адукацыі і ў розных відах дадатковай адукацыі мастацкага профілю. Іх рэалізацыя дазваляе атрымаць асобе мастацкую адукацыю на агульным (абавязковым для ўсіх, але не прафесійным, аматарскім) і (ці) прафесійным узроўнях.

У залежнасці ад рэалізуемых задач у сістэме мастацкай адукацыі вылучаюць наступныя падсістэмы: ***агульная*** (непрафесійная, аматарская) ***мастацкая адукацыя*** і ***прафесійная мастацкая адукацыя***.

Структура сістэмы мастацкай адукацыі прадстаўлена на схеме 1.




Схема 1. Структура сістэмы мастацкай адукацыі

У сістэме мастацкай адукацыі функцыянуюць *установы адукацыі,* дзейнасць якіх накіравана на атрыманне агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі, а таксама *арганізацыі,* дзейнасць якіх накіравана на забеспячэнне эфектыўнага функцыянавання сістэмы мастацкай адукацыі (бібліятэкі, музеі, навуковыя і іншыя арганізацыі).

Сярод устаноў мастацкай адукацыі найбольшае распаўсюджанне ў краіне атрымалі ўстановы разнастайных форм музычнай адукацыі, на якія ў сваім развіцці арыентуюцца і тыя, што прадстаўляюць іншыя віды мастацтва. Таму засяродзім увагу на музычнай адукацыі.

## Агульная музычная адукацыя

Мэтай дзейнасці ўстаноў агульнай музычнай адукацыі з'яўляецца фарміраванне музычнай культуры чалавека як часткі яго агульнай духоўнай культуры, развіццё музычных здольнасцей, падрыхтоўка адукаванага аматара музычнага мастацтва, які валодае асновамі музычна-творчай дзейнасці.

Да падсістэмы агульнай музычнай адукацыі адносяцца:

— установы дашкольнай адукацыі (рэалізацыя адукацыйных праграм музычнага выхавання);

— установы агульнай сярэдняй адукацыі (рэалізацыя музычна-адукацыйных праграм на базавым узроўні);

— установы прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі немузычнага профілю, якія рэалізуюць музычна-адукацыйныя праграмы (як правіла, у пазааўдыторны час) і забяспечваюць атрыманне агульнай і (ці) пачатковай прафесійнай музычнай адукацыі;

— установы дадатковай адукацыі мастацкага (музычнага) профілю (ДШМ, цэнтры, Палацы — рэалізацыя музычна-адукацыйных праграм агульнага музычна-эстэтычнага выхавання);

— сродкі масавай інфармацыі (музычна-інфармацыйныя, музычна-асветніцкія, музычна-забаўляльныя, музычна-адукацыйныя праграмы);

— тэатральна-відовішчныя арганізацыі (тэатры, філармоніі і інш.);

— прафесійныя музычныя калектывы (канцэртная дзейнасць па прапагандзе лепшых узораў нацыянальнага і сусветнага, народнага, класічнага і сучаснага музычнага мастацтва);

— рэспубліканскія грамадскія і іншыя арганізацыі, якія садзейнічаюць рэалізацыі музычна-адукацыйных праграм.

Сярод пералічаных адзначым установы і арганізацыі *сістэмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі,* якая накіравана на «развитие личности воспитанника, формирование и развитие его творческих способностей, удовлетворение его индивидуальных потребностей в интеллектуальном, нравственном, физическом совершенствовании, адаптацию к жизни в обществе, организацию свободного времени, профессиональную ориентацию» (Кодэкс, арт. 228).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі рэалізуецца па розных профілях, у тым ліку па мастацкім (музычным) і культурна-дасугавым. Профілі ўключаюць у сябе напрамкі дзейнасці (у тым ліку напрамак «Музыка»), якія вызначаюцца вучэбна-праграмнай дакументацыяй.

Музычна-адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі можа рэалізоўвацца не толькі ва ўстановах дадатковай адукацыі, але і ва ўстановах агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі.

У адпаведнасці з Кодэксам у Беларусі дзейнічаюць установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі наступных відаў: цэнтр (Палац), ДШМ (гл. схему 2). *Цэнтр (Палац)* можа рэалізоўваць адукацыйную праграму па адным ці некалькіх профілях, у тым ліку і мастацкаму (музычнаму). *ДШМ* — установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, якая рэалізуе адукацыйную праграму мастацкага профілю ў сферы культуры з вывучэннем вучэбных прадметаў, дысцыплін *на павышаным узроўні* (Кодэкс, арт. 231). Павышаны ўзровень вывучэння ўключае ў сябе базавы ўзровень адукацыйнай вобласці, тэмы, вучэбнага прадмета ці вучэбнай дысцыпліны з паглыбленнем іх зместу.




Схема 2. Музычная адукацыя ў сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі з'яўляецца ўрок. Адукацыйны працэс у ДШМ здзяйсняецца *ў групах і (ці) індывідуальна*, у цэнтрах (Палацах) — у *аб'яднаннях па інтарэсах,* якія аб'ядноўваюць дзяцей і моладзь на аснове агульнага інтарэсу да канкрэтнага напрамку дзейнасці, ці індывідуальна.

Да *аб'яднанняў па інтарэсах* адносяцца гурток, клуб, студыя, майстэрня, лабараторыя, аркестр, хор, ансамбль, тэатр, навуковае таварыства навучэнцаў і інш. Напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах першага года навучання складае ад 12 да 15 навучэнцаў, другога і наступных гадоў — не менш за 8. Пры навучанні асоб ва ўзросце ад двух да шасці гадоў напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах складае 8—10 навучэнцаў. Напаўняльнасць групы ў ДШМ складае ад 10 да 12 навучэнцаў, а пры навучанні ў ДШМ менш за 100 чалавек — ад 3 да 6. Аб'яднанні па інтарэсах і групы могуць дзяліцца на падгрупы (Кодэкс, арт. 233).

Прыём асоб для асваення зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі па мастацкім профілі здзяйсняецца на падставе заявы з прад'яўленнем пасведчання аб нараджэнні і па выніках праверкі здольнасцей (па напрамку дзейнасці «Харэаграфія» мастацкага профілю — яшчэ і на падставе медыцынскай даведкі аб стане здароўя) (Кодэкс, арт. 234).

*Тыпавыя вучэбныя планы* ДШМ устанаўліваюць пералік, паслядоўнасць і аб'ём вывучэння вучэбных прадметаў, дысцыплін, тэрмін атрымання дадатковай адукацыі ў ДШМ, парадак праходжання вучэбнай практыкі. Гэтыя планы распрацоўваюцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з арганізацыямі, якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, і зацвярджаюцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, узгадняюцца з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*Тыпавыя вучэбныя праграмы* ДШМ вызначаюць мэты і задачы вывучэння адукацыйных абласцей, тэм, вучэбных прадметаў, дысцыплін, узроўні іх вывучэння, віды заняткаў, прапануемыя формы і метады навучання і выхавання. Гэтыя праграмы распрацоўваюцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з арганізацыямі, якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры.

*Праграма аб'яднання па інтарэсах* распрацоўваецца ўстановай адукацыі на аснове тыпавой. Праграма аб'яднання па інтарэсах з павышаным узроўнем вывучэння зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## Прафесійная музычная адукацыя

Падсістэма прафесійнай музычнай адукацыі Беларусі прадстаўлена некалькімі *ўзроўнямі* (ступенямі): 1) пачатковая, 2) сярэдняя спецыяльная, 3) вышэйшая, 4) паслядыпломная (навукова-прафесійная), а таксама павышэнне кваліфікацыі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

і перападрыхтоўка на ўзроўнях сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай музычнай адукацыі.

Адукацыйныя праграмы пачатковай прафесійнай музычнай адукацыі рэалізуюцца ў наступных установах:

ДШМ (профіль музычна-прафесійнай арыентацыі);

— вучэбна-педагагічныя комплексы «школа — каледж мастацтваў» і «гімназія — каледж мастацтваў»;

— прафесійна арыентаваныя аб'яднанні па інтарэсах музычнага профілю ў цэнтрах (Палацах): студыі, музычныя калектывы народнай творчасці і інш.

У адпаведнасці з Палажэннем аб дзіцячай школе мастацтваў, зацверджаным пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2011 г. № 28, ДШМ «является учреждением дополнительного образования детей и молодежи, которое реализует образовательную программу дополнительного образования детей и молодежи художественного профиля в сфере культуры с изучением учебных предметов, учебных дисциплин на повышенном уровне».

Вывучэнне музычных прадметаў на *павышаным* узроўні, а таксама рэалізацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі музычнага профілю ажыццяўляюцца ў вучэбна-педагагічных комплексах: «базавая школа — каледж мастацтваў», «сярэдняя школа — каледж мастацтваў», «гімназія — каледж мастацтваў». У арт. 156 Кодэкса раскрываецца сутнасць дадзеных комплексаў (выдзелена аўтарам — *М. К.*):

**Базавая школа — каледж мастацтваў** — вучэбна-педагагічны комплекс, у якім здзяйсняецца навучанне і выхаванне **на I і II ступенях ці на II ступені** агульнай сярэдняй адукацыі з вывучэннем вучэбных прадметаў, змест якіх накіраваны *на развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне музычнага мастацтва*, рэалізуецца адукацыйная праграма *сярэдняй спецыяльнай адукацыі,* якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста **з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй,** а таксама можа рэалізоўвацца адукацыйная праграма *дадатковай адукацыі* музычнага профілю дзяцей і моладзі.

**Сярэдняя школа — каледж мастацтваў** — вучэбна-педагагічны комплекс, у якім здзяйсняецца навучанне і выхаванне **на I, II і III ступенях ці на II і III ступенях** агульнай сярэдняй адукацыі з вывучэннем вучэбных прадметаў, змест якіх накіраваны на *развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне музычнага мастацтва*, рэалізуецца адукацыйная праграма *сярэдняй спецыяльнай адукацыі,* якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста **з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй,** а таксама можа рэалізоўвацца адукацыйная праграма *дадатковай адукацыі* музычнага профілю дзяцей і моладзі.

**Гімназія — каледж мастацтваў** — вучэбна-педагагічны комплекс, у якім здзяйсняецца навучанне і выхаванне **на II і III ступенях** агульнай сярэдняй адукацыі з вывучэннем *на павышаным узроўні* вучэбных прадметаў, змест якіх накіраваны на *развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне музычнага мастацтва*, рэалізуецца адукацыйная праграма *сярэдняй спецыяльнай адукацыі,* якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста **з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй,** а таксама можа рэалізоўвацца адукацыйная праграма *дадатковай адукацыі* музычнага профілю дзяцей і моладзі. У **гімназіі — каледжы мастацтваў** могуць дадаткова адкрывацца I—IV класы з вывучэннем вучэбных прадметаў, змест якіх накіраваны на *развіццё здольнасцей навучэнцаў у галіне музычнага мастацтва*.

Пачатковая прафесійная музычная адукацыя Беларусі прадстаўлена наступным чынам:

| | |
|---|---|
| Дзіцячыя школы мастацтваў — 523 [1] | Дзіцячыя музычныя школы – 178;<br>дзіцячыя школы мастацтваў з музычнымі аддзяленнямі – 295;<br>харэаграфічныя – 9;<br>мастацкія – 25;<br>народных рамёстваў, народнага танца і інш. – 16 |
| Вучэбна-педагагічныя комплексы | Базавая школа — каледж мастацтваў;<br>сярэдняя школа — каледж мастацтваў;<br>гімназія — каледж мастацтваў |
| Цэнтры (Палацы) | Аб'яднанні па інтарэсах музычнага профілю — хор, аркестр, ансамбль, студыя і інш. |
| Дзіцячыя студыі і школы пры прадзюсарскіх цэнтрах, прафесійных музычных калектывах | Дзіцячы музычны тэатр-студыя пры Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь;<br>Нацыянальны цэнтр музычнага мастацтва імя У. Мулявіна;<br>эстрадна-вакальныя студыі пры ансамблі «Сябры», арт-групе «Беларусы» і інш.;<br>Тэатр песні Ірыны Дарафеевай, прадзюсарскі цэнтр А. Ціхановіча і Я. Паплаўскай і інш. |

## Музычна-адукацыйны працэс ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі

Музычная адукацыя на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі накіравана на развіццё асобы навучэнца, атрыманне ім спецыяльнай тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі з прысваеннем кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй (Кодэкс, арт. 186).

У сістэму сярэдняй спецыяльнай музычнай адукацыі Беларусі ўваходзяць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| Дзяржаўныя музычныя каледжы, каледжы культуры і мастацтваў — 13 | Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М. І. Глінкі (1924); Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М. К. Агінскага (1958); Лідскі дзяржаўны музычны каледж (1973); Віцебскі дзяржаўны музычны каледж імя І. І. Салярцінскага (1918); Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Р. Р. Шырмы (1939); Магілёўскі дзяржаўны музычны каледж імя М. А. Рымскага-Корсакава (1937); Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж (1969); Наваполацкі дзяржаўны музычны каледж (1968); Баранавіцкі дзяржаўны музычны каледж (1969); Мазырскі дзяржаўны музычны каледж (1968); Гомельскі каледж мастацтваў імя Н. Сакалоўскага (1921); Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў (1975); Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў (1948); Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў (1928); Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў (1993); Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў (1971) |
| Вучэбна-педагагічныя комплексы | Базавая школа — каледж мастацтваў; сярэдняя школа — каледж мастацтваў; гімназія — каледж мастацтваў; Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі; Магілёўская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў; Рэспубліканская гімназія-каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка; Маладзечанская гімназія-каледж мастацтваў і інш. |
| Дзяржаўныя педагагічныя каледжы – 10 | Гомельскі дзяржаўны педагагічны каледж імя Л. С. Выгоцкага (1914, 1925); Гродзенскі дзяржаўны педагагічны каледж (1939); Полацкі дзяржаўны педагагічны каледж (1872); Салігорскі дзяржаўны педагагічны каледж (1990) і інш. |

У названых і іншых установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэалізуецца таксама адукацыйная праграма *дадатковай адукацыі* музычнага профілю дзяцей і моладзі.

## Музычна-адукацыйны працэс ва ўстановах вышэйшай адукацыі

Музычная адукацыя на ўзроўні вышэйшай адукацыі накіравана на развіццё асобы студэнтаў, іх інтэлектуальных і творчых здольнасцей, атрыманне імі тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі, якая завяршаецца прысваеннем кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, ступені магістра (Кодэкс, арт. 202).

Навучанне ў вышэйшых навучальных музычных установах здзяйсняецца на аснове інтэграцыі вучэбнага працэсу з мастацка-творчай, навуковай, даследчыцкай дзейнасцю выкладчыкаў і студэнтаў. Дзяржава ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы гарантуе прадастаўленне першага працоўнага месца выпускнікам дзяржаўных устаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай музычнай адукацыі.

Сістэма вышэйшай прафесійнай музычнай адукацыі Беларусі выглядае так:

| | |
|---|---|
| Дзяржаўныя ВНУ сферы культуры | БДУ культуры і мастацтваў (1975); БДА музыкі (1918, 1932) |
| Дзяржаўныя ВНУ Міністэрства адукацыі | БДПУ (1914, падрыхтоўка настаўнікаў музыкі — з 1972 г.); Віцебскі, Магілёўскі, Мазырскі, Брэсцкі, Гродзенскі дзяржаўныя ўніверсітэты |
| Філіялы дзяржаўных ВНУ | Мазырскі філіял факультэта завочнага навучання БДУ культуры і мастацтваў; педагагічны факультэт БДАМ (Магілёў) |
| Прыватныя ВНУ | Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава (Мінск) |

## Музычная адукацыя ў сістэме дадатковай адукацыі дарослых

Адукацыя ў сістэме дадатковай адукацыі дарослых накіравана на «профессиональное развитие слушателя, стажера и удовлетворение их познавательных потребностей» (Кодэкс, арт. 240).

Сістэма забяспечвае рэалізацыю адукацыйных праграм: *павышэння кваліфікацыі* кіруючых работнікаў і спецыялістаў; *перападрыхтоўкі* кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю; *перападрыхтоўкі* кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю; адукацыйная праграма *стажыроўкі* кіруючых работнікаў і спецыялістаў; адукацыйная праграма *спецыяльнай падрыхтоўкі*, неабходная для заняцця асобных пасад; адукацыйная праграма *навучаючых курсаў* (тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў і інш.), а таксама адукацыйныя праграмы навучання ў арганізацыях, удасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы і інш. (Кодэкс, арт. 242).

Табліца 2

**Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка ў сістэме музычнай адукацыі**

| Установы | Формы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі |
|---|---|
| БДУ культуры і мастацтваў | ФПК |
| БДА музыкі | ФПК |
| БДА мастацтваў | ФПК |
| Інстытут культуры Беларусі | ФПК |
| БДПУ | ІПК |
| Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, Мінскі гарадскі і абласныя інстытуты развіцця адукацыі | Факультэты, кафедры |
| Абласныя і раённыя навукова-метадычныя цэнтры | Курсы, семінары, майстар-класы і інш. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Музычная адукацыя на ўзроўні паслядыпломнай адукацыі

Музычная адукацыя на ўзроўні паслядыпломнай адукацыі накіравана на развіццё асобы аспіранта, дактаранта, саіскальніка і рэалізацыю іх інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу, фарміраванне прафесійных навыкаў арганізацыі і правядзення навуковых даследаванняў з прысваеннем навуковай кваліфікацыі «даследчык» (Кодэкс, арт. 218).

Табліца 3

**Установы, якія рэалізуюць музычна-адукацыйныя праграмы на ўзроўні паслядыпломнай адукацыі**

| ВНУ | Навуковыя спецыяльнасці |
|---|---|
| БДУ культуры і мастацтваў | Мастацтвазнаўства;<br>культуралогія;<br>тэорыя, методыка і арганізацыя СКД |
| БДА музыкі | Мастацтвазнаўства (музыказнаўства);<br>музычнае мастацтва |
| БДПУ | Тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі) |
| Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі | Музычнае мастацтва;<br>фальклярыстыка;<br>гісторыя і тэорыя мастацтва |

Установы агульнай і прафесійнай музычнай адукацыі ў сваёй дзейнасці могуць спалучаць рэалізацыю музычна-адукацыйных праграм агульнай і прафесійнай, асноўнай і дадатковай, пачатковай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і паслядыпломнай (у розных варыянтах) адукацыі. У той жа час кожная з іх мае сваю, уласцівую толькі ёй дамінуючую функцыю ў падрыхтоўцы музыкантаў.

Прафесійная музычная адукацыя Беларусі абапіраецца на сетку ўстаноў агульнай музычнай адукацыі. Засваенне музычна-адукацыйных праграм ва ўстановах дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі мае ўсеагульны і абавязковы характар. На гэтым этапе закладваюцца музычныя інтарэсы і патрэбнасці, фарміруюцца эстэтычны густ і ідэалы, адбываецца музычна-прафесійная арыентацыя дзяцей і моладзі. Ідзе найбольш інтэнсіўнае развіццё музычных здольнасцей навучэнца, якія шмат у чым вызначаюць яго поспехі ў музычна-творчай дзейнасці. А першыя поспехі ўплываюць на прафесійнае самавызначэнне, на прыняцце рашэння аб неабходнасці атрымання пачатковай, потым — сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай музычнай адукацыі.

Сістэма музычнай адукацыі прапануе разнастайныя *варыянты музычнай прафесіяналізацыі* пачынаючы з 5 класа агульнай базавай школы: наведванне ДШМ (профіль прафесійна арыентаванай музычнай адукацыі); навучанне ў цэнтрах і Палацах па прафесійна арыентаваных музычных праграмах; навучанне ў вучэбна-педагагічным комплексе «школа (гімназія) — каледж мас-




Схема 3. Структура музычнай адукацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тацтваў» з атрыманнем сярэдняй спецыяльнай адукацыі; навучанне ў музычных і музычна-педагагічных УССА пасля 9 ці 11 класса. Падсумоўваючы, можна адзначыць, што сістэма музычнай адукацыі Беларусі як цэласнае адзінства ўстаноў і арганізацый агульнай і прафесійнай музычнай адукацыі выглядае наступным чынам (гл. схему 3; пераходныя варыянты музычнай прафесіяналізацыі выдзелены).

## Літаратура


1. Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2010 / І. В. Анціпенка [і інш.] ; пад. агул. рэд. Т. І. Стружэцкага ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі. — Мінск, 2011.


## Summary


*The following topics are considered in this article in the context of the main provisions of the «Code of the Republic of Belarus on education» (2011):*

*place of art education in the structure of the national education system;*

*structure of the system of art education;*

*institutions and organizations subsystems of General and professional art education.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Е. А. Макарова, С. В. Менькова**

# Дополнительное образование взрослых в сфере культуры в свете Кодекса Республики Беларусь об образовании


*В статье рассматриваются основные принципы и задачи дополнительного образования взрослых в сфере культуры, цель которого — реализация принципа «образование через всю жизнь» на основе внедрения современных информационно-коммуникационных технологий, интеграции профессионального образования, науки и производства.*


В современном мире значение образования как важнейшего фактора формирования нового качества экономики и общества увеличивается вместе с ростом влияния человеческого капитала. Важнейшая составляющая инновационной экономики — формирование эффективно функционирующего кадрового потенциала, отвечающего требованию непрерывного обновления знаний, умений и навыков. Современное общество как никогда нуждается в образовании, способном обеспечить высокий уровень конкурентоспособностей инновационной экономики, а также реализацию потребности личности в повышении уровня знаний на протяжении всей жизни.

Главным приоритетом государственной политики в сфере образования становится обеспечение современного качества образования на основе сохранения его фундаментальности и соответствия актуальным и перспективным потребностям личности, общества и государства. Основополагающими принципами современного образования признаются инновационность, мобильность, гибкость, динамичность, открытость, высокое качество образовательных программ.

Динамичное развитие экономики, рост конкуренции, сокращение сферы неквалифицированного и малоквалифицированного труда, глубокие структурные изменения в сфере занятости определяют постоянную потребность в повышении профессиональной квалификации и переподготовке работников, в росте их профессиональной мобильности.

Нельзя не согласиться с утверждением о «необходимости формирования целостной и гибкой системы непрерывного профессионального образования, которая бы оперативно реагировала на изменения потребностей населения и решала бы задачи социально-экономического, политического, нравственно-воспитательного характера в интересах личности, государства и общества» [5].

Создание национальной системы образования, соответствующей потребностям личности, общества и государства, подготовке новых поколений к жизни и труду в обществе с устойчивой и социально ориентированной рыночной экономикой, является стратегической целью развития Республики Беларусь. Происходящие интенсивные преобразования в экономике и общественном развитии республики, появление новых технологий требуют постоянного совершенствования квалификации кадров.

В связи с этим возрастает роль и значение системы повышения квалификации и переподготовки кадров как образовательной системы, способной оперативно обеспечить подготовку кадров к работе в новых условиях. На первое